# ТЭМА 2. СВЕТ У ЭПОХУ СТАРАЖЫТНАСЦІ

1. Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету ў эпоху старажытнасці.
2. Палітычная геаграфія Блізкага Ўсходу ў старажытнасці.
3. Палітычная геаграфія Усходняй і Паўднёвай Азіі ў старажытнасці.

**Літаратура**


Максаковский, В.П. Историческая география мира/ В.П. Максаковский. - М., 1997.
Народонаселение: прошлое, настоящее, будущее. - М., 1987.
Шелестов, Д.К. Историческая демография/ Д.К. Шелестов. - М., 1989.


**1. Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету ў эпоху старажытнасці.** Першымі ад збіральніцтва і палявання да земляробства і жывёлагадоўлі ў канцы мезаліта перайшлі плямёны, якія засялялі урадлівыя вобласці Месапатаміі (Міжрэчча, Двурэчча), даліну Ніла, тэрыторыю Палестыны, даліны рэк Інд, Хуанхэ. Менавіта таму тут узніклі першыя цэнтры цывілізацый. Сталі фарміравацца першыя гарады Ур, Урук, Ніпур, Лагаш, Вавілон, Ашур, Ніневія, Сузы, Бібл, Сідон, Цір, Абідас, Фівы, Мемфіс, Махенджа Даро, Латхал, Харапа. Паступова сталі развівацца транспарт і шляхі зносін. У старажытны перыяд у Азіі (таксама ў Егіпце) праходзілі актыўныя міграцыі насельніцтва. У 2 тыс. да н.э. жыхары Месапатаміі перажылі нашэсце куціяў (гуціяў), касітаў, а пазней паслядоўна адбываецца рассяленне амарэяў (суціяў) і арамеяў у Пярэдняй Азіі. Жыхары Егіпта ў 2 тыс. да н.э. перажылі ўварванне гіксосаў, пазней лівійцаў. На рубяжы 2-1 тыс. да н.э. адбываецца г.зв. “катастрофа бронзавага веку”, якая характарызуецца нашэсцем на Блізкі Ўсход “народаў мора”. У Месапатаміі пачынаецца актыўная “арамеізацыя” насельніцтва.

**2. Палітычная геаграфія Ўсходняга Міжземнамор’я ў старажытнасці.** На месцы першых цывілізацыйных цэнтраў сталі фарміравацца першыя дзяржавы. У 4-3 тыс. да н.э. аформілася Егіпецкае царства са сталіцай ў Мемфісе. На тэрыторыі Месапатаміі ў 4 тыс. да н.э. аформіўся Шумер, а затым паступова, змяняючы адно другое, часта знікаючы і ўваскрасаючы зноў існавалі наступныя дзяржавы: *Акадскае царства* (24-22 ст. да н.э.) з аднайменнай сталіцай Акад, а затым *Шумера-Акадскае царства* (22-20 ст. да н.э.). У 24 ст. да н.э. стала афармляцца *Асірыйская дзяржава* з цэнтрам у Ашуры. Пасля нашэсця амарэяў у Месапатаміі аформілася *Старававілонскае царства*. У выніку экспансіі хурытаў у 2 тыс. да н.э. узікла *Мітані* (Ханігальбат)са сталіцай у Хашкані. У 3 тыс. да н.э на тэрыторыі паўднёва-заходняга Ірана ўзнік *Элам* са сталіцай ў Сузах. У Закаўказзі аформілася дзяржава *Урарту*. У Малой Азіі з 17 па 8 ст. да н.э. існавала

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Хецкая дзяржава*, пазней на тэрыторыі Анатоліі ўзнікла *Лідыя* са сталіцай у Сардах. Тэрыторыя сучасных Ізраіля, Палесціны, Лівана, Сірыі, Іарданіі ў старажытнасці называўся *Ханаан*. Тут склаліся дзяржаўныя ўтварэнні філісцімлян, фінікійцаў, яўрэяў (*Ізраільскае і Іўдэйскае царствы*).

Шэраг дзяржаў Старажытнага ўсходу на розных этапах свайго развіцця дасягалі вялізарных памераў, пераўтвараючыся ў своеасаблівыя імперыі. Да дзяржаў такога тыпу можна аднесці Акадскую дзяржаву, Асірыйскую дзяржаву ў новасірыйскі перыяд, Вавілонскае царства ў нававілонскі перыяд, Мідыйскую дзяржаву, Персідскую дзяржаву Ахеменідаў.

Заваяванне Аляксандрам Македонскім *Персідскай дзяржавы* ў 4 ст. да н.э. карэнным чынам змяніла палітычную карту Блізкага Ўсходу. Пачаўся перыяд афармлення ***эліністычных дзяржаў***. Узніклі *Сірыйскае царства Селеўкідаў* (сталіцы Селеўкія, Антыёхія), *Егіпецкае царства Пталемеў* (сталіца - Александрыя), *Бактрыя* (Грэка-Бактрыйскае царства) са сталіцай у Бактрах (пазней ў Александрыі Каўказскай), *Інда-грэчаскае царства, Парфянскае царства* (сталіцы Ніса, Ктесіфон, Селеўкія). У Прычарнамор'і ў элiністычны перыяд аформіліся такія дзяржавя як *Баспорскае царства* (сталіца Пантыкапей), *Панційскае царства* (сталіцы Амасья, Сіноп, Пергам), *Пергамскае царства, Віфінія* (сталіца Нікамедыя), *Галацiя* і інш.

**3. Палітычная геаграфія Паўднёвай і Ўсходняй Азіі ў старажытнасці.** На тэрыторыі Паўднёвай Еўропы старажытнейшыя дзяржаўныя ўтварэнні сфарміравалія ў даліне ракі Інд. Менавіта тут аформілася знакамітая *Індская цывілізацыя*. Гэтая цывілізацыя ў параўнанні са сваімі сучаснікамі (шумерскай і старажытнаегіпецкай займала найбуйнейшую плошчу). Найбольш значнымі цэнтрамі гэтай цывілізацыі былі Ракхігархі, Махенджа-Даро, Харапа, Латхал, Дхалавіра. У выніку індаіранскага прасоўвання ў Індыю аформілася *Ведыйская цывілізацыя*.

З заканчэннем ведыйскага перыяду ў 6 ст. да н.э. Індыі з'явілася шмат ***махаджанападаў*** – незалежных дзяржаўных утварэнняў. *Магадха. Нанда. Пандыя.* У 3 ст. да н.э. узвысілася *Імперыя Маўр'еў* са сталіцаў у Паталіпутры. Вынікам моцнага ціску на Індыю звонку ўтварыліся *Інда-Грэчаскае, Інда-Скіфскае* (сталіцы Сігал, Таксіла, Матхура), *Інда-Парфянскае царствы* (сталіцы – Таксіла, Кабул), *Кушанская імперыя* (сталіцы Бактра, Пешавар). У 4 ст. у Індыі аформілася вялізная *дзяржава Гуптаў* са сталіцай у Паталіпутры. У перыферыйных раёнах Індыі ў старажытны перыяд існавалі дзяржавы *Панд'я, Калінга, Чола, Палава, Сатавахана* (дзяржава Андхра), *Шунга* (сталіцы – Паталіпутра, Ведзіша). *Кунінда*.

У Кітай ў даліне ракі Хуанхэ ў 3 тыс. да н.э. зарадзілася дзяржава на чале з дынастыяй *Ся*. У 2 тыс. да н.э тут жа ўтварылася першае дзяржаўнае

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўтварэнне Старажытнага Кітая – *дзяржава Інь* (Шань). Сярод найбольш важных цэнтраў гэтай дзяржавы выдзяляюць гарады Іньсюй і Чжаогэ. На працягу 1 тыс. да н.э. у міжрэччы Хуанхэ і Янцзы існавала *дзяржава дынастыі Чжоў*. Пасля зацягнуўшагася "перыяду Варагуючых царстваў" ў 3 ст. да. н.э. *дынастыяй Цынь*. У перыяд з 3 ст. да н.э. па 3 ст. н.э. на тэрыторыя Кітая існавала *імперыя Хань* (сталіцы – Чан'ань, Лаян).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ